*Т.І. ШАМЯКІНА*

# ПЕРАЕМНАСЦЬ ТРАДЫЦЫЙ
## (гісторыя кафедры - гісторыя беларускага літаратуразнаўства)



***Шамякіна Таццяна Іванаўна*** - доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аўтар звыш 300 публікацый, сярод якіх манаграфіі «На лініі перасячэння» (1981), «Беларуская класічная літаратура і міфалогія» (2001), падручнікаў для ВНУ: «Міфалогія Беларусі» (2000), «Славянская міфалогія (2005)»; шэрага падручнікаў для базавай школы па беларускай літаратуры (8-10 кл.). Сфера навуковых інтарэсаў - беларуская літаратура, славянская міфалогія і культуралогія.

Кафедра беларускай літаратуры і культуры - адна са старэйшых на філалагічным факультэце. Беларускі дзяржаўны універсітэт адкрыўся ў 1921 г., а ў 1922 г. у ім утварылася літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта. Шэраг выдатных дзеячаў культуры - пісьменнік і навуковец К.М. Міцкевіч (Якуб Колас), акадэмік Акадэміі навук Беларусі І.І. Замоцін, прафесары Я.І. Барычэўскі, А.М. Вазнясенскі, М.М. Піятуховіч, асістэнт А.А. Бабарэка бралі ўдзел у падрыхтоўцы курса па гісторыі беларускай літаратуры. Першым загадчыкам кафедры беларускай літаратуры і этнаграфіі стаў І.І. Замоцін. У 1931 г., калі быў адчынены Вышэйшы педагагічны інстытут, падрыхтоўка філолагаў перамясцілася туды, але ў 1939 г. і ў БДУ адкрылі філалагічны факультэт з двума аддзяленнямі: беларускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры. Пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны універсітэт перапыніў сваю дзейнасць.

У 1943 г. на станцыі Сходня пад Масквой БДУ адрадзіўся. Франтавік М.Р. Ларчанка пасля ранения ўзначаліў філалагічны факультэт і кафедру беларускай мовы і літаратуры. У самастойную навукова-педагагічную адзінку кафедра беларускай літаратуры вылучылася ў 1956 г. Яе загадчыкам аставаўся М.Р. Ларчанка.

На кафедры з таго часу працавалі выдатныя пісьменнікі і навукоўцы: М.Р. Ларчанка, С.Х. Александровіч, І.Я. Навуменка, Н.С. Гілевіч, А.А. Лойка, В.В. Казлова, К.Р. Хромчанка, Л.А. Царанкоў, М.Б. Яфімава. Некаторыя з іх і сёння з'яўляюцца актыўнымі даследчыкамі ў навуцы і творцамі ў літаратуры.

У 1971-1972 гг. кафедру ўзначальваў прафесар і вядомы пісьменнік І.Я. Навуменка, які пазней стаў дырэктарам Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларусі, акадэмікам, віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук.

З 1972-1985 гг. кафедрай кіравала дацэнт В.В. Казлова, вучаніца М.Р. Ларчанкі, якая пачынала вучыцца ў БДУ яшчэ на станцыі Сходня. Амаль увесь адзначаны перыяд кафедра трымала першае месца на факультэце і нават ва універсітэце па выніках сацыялістычнага спаборніцтва.

У 1985 г., калі загадчыкам кафедры беларускай літаратуры стаў доктар філалагічных навук, прафесар А.А. Лойка, яна значна вырасла колькасна і ўключала больш за 20 супрацоўнікаў. Чыталіся курсы не толькі па гісторыі беларускай літаратуры, але і па тэорыі літаратуры, фалькларыстыцы, тэорыі і гісторыі сусветнай культуры, эстэтыцы.

У 1994 г. кафедра па ініцыятыве дэкана і загадчыка кафедры А.А. Лойкі раздзялілася на некалькі новых навукова-педагагічных адзінак: узніклі кафедры гісторыі беларускай літаратуры, тэорыі літаратуры, славянскіх літаратур. Кафедра беларускай літаратуры - вядучая - пачала называцца кафедрай беларускай літаратуры ХХ ст.

У 2000 г. кафедру ўзначаліла малады доктар навук, прафесар Л.Дз. Сінькова. Тут забяспечвалася выкладанне наступных лекцыйных курсаў: сучасная літаратура Беларусі, беларуская літаратура ХХ-ХХІ ст., гісторыя беларускай крытыкі. Курсы чыталіся як на аддзяленні беларускай філалогіі, так і на іншых аддзяленнях філалагічнага факультэта. Кафедра заставалася цэнтрам вывучэння беларускай літаратуры ХХ ст., метадычным цэнтрам выкладання беларускай літаратуры сярод ВНУ рэспублікі. Вучоныя ўнеслі прыметны ўклад у навуку пра літаратуру, а таксама шмат зрабілі для развіцця літаратурна-філалагічнай адукацыі ў рэспубліцы.

У 2004 г., у выніку рэарганізацыі факультэта, была ліквідавана кафедра беларускай лінгвістыкі і міфалогіі. Некаторыя яе выкладчыкі (у былым - выхаванцы кафедры беларускай літаратуры: І.В. Казакова, У.А. Навумовіч, Т.І. Шамякіна) далучыліся да кафедры беларускай літаратуры ХХ ст. Апошняя некалькі змяніла прыярытэты і пачала называцца кафедрай беларускай літаратуры і культуры. Узначаліла яе прафесар Т.І. Шамякіна, якая закончыла аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры яшчэ ў 1971 г. і амаль 20 гадоў працавала менавіта на гэтай кафедры.

На сённяшні дзень тут працуюць чатыры дактары навук, прафесары (А.І. Бельскі, Л.Дз. Сінькова, М.А. Тычына, Т.І. Шамякіна), кандыдат навук, прафесар (Д.Я. Бугаёў), доктар навук, прафесар кафедры (І.В. Казакова), чатыры кандыдаты навук, дацэнты (А.Л. Верабей, П.І. Навуменка, У.А. Навумовіч, У.В. Рагойша), кандыдат навук, ст. выкладчык (Л.В. Алейнік), тры ст. выкладчыкі (Т.В. Вельская, Л.У. Карпава, Л.А. Ламека).

Супрацоўнікі кафедры чытаюць наступныя курсы: беларуская літаратура ХХ-ХХІ ст., сучасная беларуская літаратура, гісторыя беларускай крытыкі, славянская міфалогія, гісторыя і тэорыя сусветнай культуры, гісторыя культуры Беларусі, беларусазнаўства. Лекцыйная праца вядзецца не толькі на філалагічным факультэце, але і на біялагічным, на факультэце міжнародных адносін.

Пра кола навуковых інтарэсаў выкладчыкаў кафедры сведчаць наступныя тэмы, якія выконваліся ў мінулым пяцігоддзі:

1. «Беларуская культура (мова - міфалогія - фальклор - літаратура) у сусветным кантэксце: тэарэтыка-гістарычны аспект» (нефінансуемая, кіраўнік - прафесар Т.І. Шамякіна). Даследаванне насіла як абагульняючы,

так і піянерскі характер. У працэсе даследавання фактычна праведзена рэстаўрацыя беларускай міфалогіі, вызначаны асноўныя міфалагемы ў айчынным фальклоры і прыгожым пісьменстве. Усё гэта - упершыню ў беларускай філалагічнай навуцы. Распрацавана шмат праблем у беларускай літаратуры ў сувязі з аналізам міфапаэтыкі.

2. «Дынаміка беларускага літаратурнага працэсу ХХ ст.» (нефінансуемая, навуковы кіраўнік - прафесар Л.Дз. Сінькова). Вызначаны заканамернасці і асаблівасці эвалюцыі і дынамікі развіцця беларускай літаратуры ў ХХ ст.

3. «Канцэптуальныя асновы беларускай літаратуры ХХ ст. як цэласнага гісторыка-культурнага перыяду» (бюджэтная, навуковы кіраўнік - прафесар Л.Дз. Сінькова). Беларуская літаратура прааналізавана ў яе асноўных тэндэнцыях, заканамернасцях і асаблівасцях як адзіны культурна-гістарычны феномен.

4. «Заканамернасці развіцця беларускай літаратуры ХХ ст. у славянскім кантэксце» (бюджэтная, навуковы кіраўнік - прафесар А.І. Бельскі). Асноўнай мэтай навуковага праекта з'яўлялася даследаванне заканамернасцяў, тэндэнцый і асаблівасцяў эвалюцыі беларускай літаратуры ХХ ст. у агульнаславянскім гісторыка-літаратурным і культурным кантэксце. Выяўлены формы літаратурных кантактаў і сувязяў на падставе значнага канцэптуальнага матэрыялу.

За мінулыя пяць гадоў выдадзены наступныя навуковыя манаграфіі: Бельскі А.І. Беларуская літаратура ХХ ст.: гісторыя і сучаснасць (Мн., 2005); Бугаёў Д.Я. Уладзімір Дубоўка: кніга пра паэта (Мн., 2005); Верабей А.Л. Уладзімір Караткевіч: Жыццё і творчасць. 2-е выд., дапрац. і выпр. (Мн., 2005); Казакова І.В. Каменны пояс Беларусі (Мн., 2004); Лойка А.А. Дрэва жыцця: Кніга аднаго лёсу (Слонім, 2004); Шамякіна Т.І. Беларуская класічная літаратура і міфалогія (Мн., 2001).

У навукова-метадычным плане кафедра ў асноўным распрацоўвала базавыя і тыпавыя праграмы ў сувязі са змяненнем статуса БДУ. Але выдаваліся і метадычныя распрацоўкі, прызначаныя для самастойнай работы студэнтаў. У прыватнасці, выйшаў падручнік (пад грыфам) Т.І. Шамякінай «Міфалогія Беларусі» (Мн., 2000); а таксама яе дапаможнікі: Беларуская класічная літаратурная традыцыя і міфалогія (Мн., 2001); Эсхатология (Мифы о Потопе) (Мн., 2002); Культура Кітая (Мн., 2005); Культура Індыі (Мн., 2005); Славянская міфалогія. Курс лекцый (Мн., 2005), Казаковай І.В. Беларускі фальклор. Курс лекцый (Мн., 2002). Найбольш важкае дасягненне кафедры: за 2005/06 г. падрыхтаваны і выдадзены тыпавыя праграмы па асноўных лекцыйных курсах - «Славянская міфалогія» (аўтар Т.І. Шамякіна), «Беларуская літаратура ХХ - пачатку ХХІ стст.» (аўтары А.І. Бельскі, А.Л. Верабей, П.І. Навуменка, У.А. Навумовіч, М.А. Тычына, Т.І. Шамякіна), «Гісторыя беларускай крытыкі» (аўтар Л.В. Алейнік).

Выкладчыкі кафедры шмат робяць для сярэдняй школы. Так, А.І. Бельскі, Д.Я. Бугаёў, М.А. Тычына, Л.Дз. Сінькова, Т.І. Шамякіна ствараюць праграмы і падручнікі для ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй адукацыі з паглыбленым і профільным вывучэннем беларускай літаратуры. У прыватнасці, выйшлі праграмы для 9, 10, 11 класаў з новай канцэпцыяй выкладання беларускай літаратуры, распрацаванай менавіта названымі аўтарамі. Выйшлі з друку наступныя вучэбныя дапаможнікі: Бельскі А.І. Класікі і сучаснікі ў школе (Мн., 2005); Бельскі А.І., Навуменка П.І., Шамякіна Т.І. і інш. Беларуская літаратура. XI-XX стст. 2-е выд. (Мн., 2001) (пад грыфам); Бугаёў Д.Я. Жыццё і творчасць Васіля Быкава // БугаёўД.Я., Верціхоўская М.І., Верціхоўская В.У. Вывучэнне творчасці Васіля Быкава ў школе (Мн., 2005); Навумовіч У.А. Беларуская літаратура. Для сярэдніх спецыяльных устаноў (Мн., 2001); Шамякіна Т.І. Міфалогія і літаратура. 11-12 класы (Мн., 2004) (пад грыфам); Шамякіна Т.І. выступав як адзін

з сааўтараў падручніка «Беларуская літаратура» (Мн., 2004) для 10 класа і «Беларуская літаратура» для 11 класа (Мн., 2005) для ўстаноў з паглыбленым і профільным вывучэннем беларускай літаратуры (пад грыфам).

А.І. Бельскі - галоўны рэдактар навукова-метадычнага часопіса «Беларуская мова і літаратура», намеснік галоўнага рэдактара навукова-метадычнага часопіса «Роднае слова». Навуковымі кансультантамі часопіса «Роднае слова» з'яўляюцца супрацоўнікі кафедры А.А. Лойка, М.А. Тычына, Т.І. Шамякіна. У рэдкалегію навуковага часопіса «Веснік БДУ» з членаў кафедры ўваходзяць Л.Дз. Сінькова і Т.І. Шамякіна. Шмат хто з членаў кафедры ўваходзіць у рэдкалегіі часопісаў і навуковых зборнікаў. Членамі розных вучоных саветаў, саветаў па абароне і экспертных саветаў ВАК з'яўляюцца: А.І. Бельскі, І.В. Казакова, У.А. Навумовіч, Л.Дз. Сінькова, М.А. Тычына, Т.І. Шамякіна.

За пяць гадоў выкладчыкі на кафедры выдалі каля 200 навуковых артыкулаў, у якіх асветлены праблемы міфапаэтыкі; ідэйна-эстэтычныя аспекты класічнай і сучаснай беларускай літаратуры; прааналізаваны нацыянальны вобраз свету ў беларускай літаратуры; дынаміка жанравых структур у беларускай прозе XX ст. Выключна плённа супрацоўнікі кафедры выступаюць на шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях у Беларусі і за яе межамі (усяго прынялі ўдзел, уключаючы членаў былой кафедры беларускай лінгвістыкі і міфалогіі, у 63 канферэнцыях).

На кафедры рэгулярна выдаюцца два навуковыя зборнікі: «Міфалогія - фальклор - літаратура: праблемы паэтыкі» (сумесна з кафедрай тэорыі літаратуры) і «Беларускае літаратуразнаўства», працуе кабінет беларускай філалогіі, ідзе актыўнае стварэнне музея народнай культуры.

На працягу дзесяцігоддзяў кафедра з'яўлялася кузняй маладых пісьменніцкіх кадраў. Тут працавала літаратурнае аб'яднанне «Узлёт», якім кіравалі А.А. Лойка і А.А. Пашкевіч. Сярод супрацоўнікаў кафедры - шэсць членаў Саюза беларускіх пісьменнікаў і два - Саюза пісьменнікаў Беларусі.

За пяць гадоў абаранілі: доктарскую дысертацыю - Т.І. Шамякіна (2001 г.), кандыдацкія дысертацыі: Л.Г. Бараноўская (навук. кіраўнік - А.І. Бельскі); Друк Г.М. (навук. кіраўнік - А.І. Бельскі), Т.М. Пучынская (навук. кіраўнік-А.І. Бельскі), Т.І. Мароз (навук. кіраўнік - А.І. Бельскі); А.М. Дарагакупец (навук. кіраўнік - Д.Я. Бугаёў), Н.В. Кузьміч (навук. кіраўнік- Д.Я. Бугаёў), Р.К. Казлоўскі (навук. кіраўнік- Д.Я. Бугаёў), В.Ф. Падстаўленка (навук. кіраўнік-Д.Я. Бугаёў); Л.В. Алейнік (навук. кіраўнік- Л.Дз. Сінькова), В.У. Барысенка (навук. кіраўнік - Л.Дз. Сінькова), В.В. Жыбуль (навук. кіраўнік - Л.Дз. Сінькова); І.Л. Шаўлякова-Барзенка (навук. кіраўнік- Т.І. Шамякіна), М.А. Трыфаненкава (навук. кіраўнік- Т.І. Шамякіна), В.А. Смірнова (навук. кіраўнік- Т.І. Шамякіна). Падрыхтоўка кадраў праз аспірантуру і дактарантуру для ВНУ, для навукова-даследчай дзейнасці ў рэспубліцы - адна з найважнейшых задач кафедры.

Члены кафедры актыўна супрацоўнічаюць з навуковымі інстытутамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Яны прадстаўлены ў саветах, удзельнічаюць у сумесных канферэнцыях, напісанні падручнікаў, узаемна рэцэнзуюць рукапісы, манаграфіі і зборнікі. Так жа плённа выкладчыкі кафедры супрацоўнічаюць з Нацыянальным інстытутам адукацыі, з іншымі універсітэтамі краіны, а таксама навучальнымі ўстановамі Польшчы, Балгарыі, Германіі, Украіны, Расіі і інш. Загадчык аддзела тэорыі літаратуры Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі прафесар М.А. Тычына працуе сумяшчальнікам на кафедры.

У 2005 г. кафедра была адным з арганізатараў І Міжнароднай этналінгвістычнай канферэнцыі; у 2006 г. арганізавала і правяла Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Фальклор і сучасная культура», якая атрымала шырокі рэзананс у СМІ рэспублікі.

На кафедры вядзецца вялікая грамадска-выхаваўчая работа. Толькі за 2005/06 г. тут праведзены: Навуменкаўскія чытанні, Караткевічаўскія чытанні, Шамякінскія чытанні, Мележаўскія чытанні. Быў арганізаваны круглы стол сумесна з Інстытутам літаратуры НАН Беларусі і часопісам «Полымя». Неаднаразова кафедра наладжвала літаратурныя вечары, дыспуты, запрашала выступаць перад студэнтамі вядомых пісьменнікаў і навукоўцаў, у тым ліку ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

Гісторыя кафедры беларускай літаратуры і культуры БДУ - гэта ў многім гісторыя ўсяго беларускага літаратуразнаўства.